# З. Бядуля «На Каляды к сыну»: праблема маральнага выбару (7 клас)

**В. В. Адамовіч,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
СШ № 5 г. Мазыра

**Мэта:** мяркуецца, што на прыканцы ўрока вучні зразумеюць і вызначаць праблемы, акрэсленыя ў апавяданні (праблемы маральнага выбару, гуманных адносін да бацькоў, вернасці свайму народу, праблема сацыяльнай няроўнасці), на прыкладзе апавядання дзеці зразумеюць, што трэба імкнуцца скараціць няроўнасць унутры краін і паміж імі, каб дасягнуць устойлівага развіцця.

**Задачы:** выпрацоўваць уменне вучняў параўноўваць, аналізаваць, рабіць высновы, асэнсавана выказваць свае погляды на твор і яго герояў, на саму асобу аўтара; развіваць аналітыка-сінтэтычныя ўменні вучняў і іх жыццёвыя ідэалы, развіваць тэатральнае майстэрства школьнікаў, выпрацоўваць навыкі выразнага чытання, далучыць школьнікаў да адвечнай маральнай праблемы – праблемы бацькоў і дзяцей, забяспечанай старасці, праблемы сацыяльнай няроўнасці; садзейнічаць выхаванню пачуцця абавязку перад бацькамі, перад сваёй краінай, перад светам.

**Тып урока:** камбінаваны.

**Формы работы:** індывідуальная, калектыўная, інсцэніроўка.

**Абсталяванне:** малюнкі, фотаздымкі мацярэй, схема “Кругі Эйлера”, тэкст апавядання, мабільныя тэлефоны (каб карыстацца анлайн-слоўнікам “Скарнік. бай”).

**Эпіграф:** 1. Нашы дзеці – наша старасць. Правільнае выхаванне – гэта наша шчаслівая старасць.

*А.С. Макаранка.*

2. Не ідзі ззаду мяне – магчыма, я не павяду цябе.

Не ідзі наперадзе мяне – магчыма, я не пайду за табой.

Ідзі побач, і мы будзем адным цэлым.

*Індзейская прыказка.*

**Ход урока**

**1. Арганізацыйны момант. Псіхалагічны настрой на ўрок**

- Добры дзень. Сённяшні ўрок мне хочацца пачаць з прытчы. Паслухайце яе ўважліва, калі ласка:

*Дзве дзяўчыны прыйшлі да Бога папрасіць шчасця на ўсё жыццё. Здзівіўся Бог: так не бывае. Чалавечае жыццё featuresнае.* 

*Першая сказала: “Навошта мне шчасце ў старасці?! Я зараз яго хачу зведаць, калі ўсё так прывабліва, так жадана…”*

*Другая разважыла: “Цяпер я маладая і дужая і здолею вытрымаць выпрабаванні лёсу, а ў старасці ў мяне не будзе сіл і мне патрэбен будзе догляд, каб хтосьці паклапаціўся пра мяне…”*

*Старасць не можа быць шчаслівай, але яна можа і павінна быць годнай, спакойнай і дагледжанай.*

- Давайце паразважаем над сэнсам прытчы. Якая яе асноўная думка?

*(Асноўная думка заключаецца ў апошнім радку: “Старасць не можа быць шчаслівай, але яна можа і павінна быць годнай, спакойнай і дагледжанай”. І што ў кожнага з нас ёсць абавязак перад сваім сумленнем: дагледзець сваіх бацькоў, зрабіць іх старасць годнай.)*

**2. Мэтавызначэнне**

- Малайцы, вы зрабілі правільныя вывады. Сёння на ўроку мы з вамі асвятлім вельмі складаныя пытанні:

**Праблема маральнага выбару герояў апавядання**.

**Праблема сацыяльнай няроўнасці**. *(Праблемы запісаны на дошцы)*

- Але спачатку высветлім, як вы разумееце значэнне слова **праблема**?

*( Дзеці выказваюць свае меркаванні, калі ім цяжка, то прапаноўваю ім карыстацца анлайн-слоўнікам “Скарнік.бай”. Праблема – важнае пытанне, якое патрабуе вырашэння.)*

- Як вы разумецце слова **мараль**?

*(Правілы, нормы паводзін людзей у адносінах паміж сабой. Павучальны вывад з чаго-небудзь.)*

- Зрабіце вывад, што ж такое **маральны выбар**?

*(Выбар, які адпавядае правілам маралі, якому ўласціва высокая мараль. Сітуацыі маральнага выбару могуць быць рознымі. У залежнасці ад сваіх мэт і каштоўнасцеў трэба падыходзіць да іх вырашэння.)*

- І апошняе, растлумачце лексічнае значэнне словазлучэння **сацыяльная няроўнасць.**

*(Гэта няроўнасць, абумоўленая падзелам грамадства на класы.)*

- Якія мэты вы паставіце перад сабой, прааналізаваўшы асноўныя пытанні ўрока?

*Словы-апоры на дошцы:* навучуся… высветлю… зразумею…

**3. Праверка дамашняга задання**

3.1. **Прыдумаць рэкламу да апавядання:** станьце аўтарам невялікага рэкламнага паведамлення аб праблемах, узнятых у творы З. Бядулі “На Каляды к сыну”.

- Малайцы. Мэты перад сабой паставілі. Дзеці, на нашым уроку прысутнічае шмат гасцей. Давайце іх зацікавім творам, прарэкламуем яго. ***(Дадатак 1)***

- Звяртаю вашу ўвагу, што астатняе дамашняе заданне будзе правярацца на працягу ўрока, паступова.

**3.2. Падрыхтаваць серыю малюнкаў “Паход Тэклі ў горад. Сустрэча з сынам” з падабранымі цытатамі.**

**3.3. Падрыхтоўка інсцэніроўкі “Сутрэча маці і сына”.**

**3.4. Падабраць прыказкі пра бацькоў.**

**4. Праблемныя пытанні. Успрыманне вучнямі праблемы ўрока.**

- Прапаную вам запісаць рад асацыяцый, да паняцця “бацькі і дзеці”. Першы рад запісвае назоўнікі-асацыяцыі, другі – дзеясловы, трэці – прыметнікі.

*(Калі вы ў вучняў развівалі асацыятыўнае мысленне, то гэта заданне не выклікае цяжкасцей. Прыкладныя асацыяцыі: любоў, павага, шчасце, адказнасць, спакой, сябры, клопат, узаемаразуменне, сям’я; шанаваць, любіць, берагчы, дапамагаць; добрыя, вясёлыя, адказныя, клапатлівыя. Адзін прадстаўнік ад кожнага рада запісвае словы на дошцы, калі дзеці іх называюць. )*

- Вы толькі паглядзіце, з якімі прыгожымі словамі ў вас асацыіруецца паняцце “бацькі і дзеці”. Гэта вельмі добра.

- Але не заўсёды адносіны бацькоў і дзяцей шчаслівыя. Зараз вернемся да праблем нашага ўрока. Разабрацца з імі нам дапамогуць дадатковыя пытанні. *(Пытанні настаўнік размяшчае на дошцы)*

- **Што адбываецца з чалавекам, калі ён траціць сувязь з бацькоўскім домам?**

- **Чаму бацькі вырашылі аддаць сына на выхаванне пану? Ці правільны маральны выбар яны зрабілі ў жыцці?**

- **Як дзеці павінны ставіцца да сваіх бацькоў?**

- **Чаму Лаўрук зрабіў такі маральны выбар – не прызнаў маці?**
- **Хто вінаваты ў тым, што дзеці не паважаюць, не любяць сваіх бацькоў?**
- **Ці актуальныя гэтыя праблемы сёння?**

**5. Вырашэнне праблемных пытанняў урока**

**5.1. Аналітычная гутарка**

- Раскжыце пра жыццё Лаўручка, пачынаючы з дзяцінства і заканчваючы момантам, калі герой пайшоў вучыцца на адваката.
- Як ставіліся бацькі да таго, што іх сын становіцца панам, пацвердзіце сваё меркаванне словамі з тэксту.
- З прапанаваных якасцей выберыце 5, якія, на ваш погляд, найбольш дакладна характарызуюць Лаўрука. ***(Клапатлівы, ветлівы, эгаістычны, пагардлівы, абыякавы, працалюбівы, смяецца са сваіх бацькоў, малады, прыбраны, саромеецца бацькоў.*** *Якасці размешчаны на дошцы, непатрэбныя здымаюцца.****)***
- Якім стаў Лаўрук, калі адарваўся ад роднага дома? Што адбываецца з чалавекам, калі ён траціць сувязь з бацькоўскім домам?
- Раскажыце пра жыццё Тэклі з Цыпруком і пасля яго смерці.
- Якая існавала сістэма грамадскіх зносін? Чаму бацькі вырашылі аддаць сына на выхаванне пану?

*(Настаўнік падводзіць дзяцей да вываду, што ў грамадстве існавала сацыяльная няроўнасць, і бацькі вырашылі аддаць сына на выхаванне пану, каб Лаўрук жыў лепш за іх. )*

- Як ставіліся аднавяскоўцы да Тэклі? Якія давалі ёй парады? Як успрымала Тэкля гэтыя парады? Падцвердзіце свае словы тэкстам.
- З прапанаваных якасцей выберыце 5, якія, на ваш погляд, найбольш дакладна характарызуюць Тэклю. ***(Гутарлівая, слабенькая, шчаслівая, разгубленая, адзінокая, вясёлая, спалоханая).***
- Расстаўце якасці ў тым парадку, як мяняецца наша гераіня па працягу апавядання. ***(1. Гутарлівая; 2. Слабенькая, адзінокая; 3. Разгубленая, спалоханая.*** *Адзін вучань працуе каля дошкі.****)***

**Фізкультхвілінка**

- Я вам прапаную крышку адпачыць. Сёння на ўрок вы прынеслі фотаздымкі сваіх маці, размясціце іх на дошцы і скажыце добрыя і ласкавыя словы сваёй маці, а можа хтосьці захоча папрасіць прабачэнне ў самага роднага чалавека.

- Звярніце, калі ласка, сваю ўвагу на гэту карцінку, яна вам усім знаёма. ***(Дадатак 2.** Настаўнік размяшчае карцінку на дошцы.)*

- Што вы адчуваеце, гледзячы на малюнак? Якія эмоцыі ён выклікае?

- Якую б назву вы далі карцінцы? Што вы адчуваеце у сувязі з назвай? Кім бы вы былі на гэтым малюнку? Які вывад вы зробіце?

*(Вучні, хутчэй за ўсё, адзначаць, што яны адчуваюць смутак – слёзы наварочваюцца на вочы. Назвы, якія падабралі дзеці ў час урока: "Усё для цябе, сынок!", "Жыццё за сына!", "Жыву дзецьмі!" Вывад: бацька аддае сыну частку сябе і робіць ён гэта ўжо не першы раз. Бацькі кожны дзень пражываюць для нас і робяць усё, каб мы былі шчаслівыя. Трэба з любоўю і павагай адносіцца да іх,)*

- Мае шаўныя вучні, я згодна з вамі, што трэба любіць і шанаваць сваіх бацькоў і часцей гаварыць ім ласкавыя словы, таму адно з дамашніх заданняў сёння будзе такое: калі вы прыйдзеце дадому, абдыміце сваіх бацькоў і скажыце тыя словы, якія вы гаварылі тут, стоячы перад усім класам, не саромейцеся сваіх пачуццяў.

**5.2. Серыя малюнкаў (выкарыстанне тэхнікі візуалізацыі) "Паход Тэклі ў горад. Сустрэча з сынам" з падабранымі цытатамі** *(Дамашняе заданне, два вучні. Кожны вучань абараняе свой малюнак, тлумачыць выбар цытат.)*

- Адно з дамашніх заданняў было падрыхтаваць малюнкі "Дарога Тэклі ў горад. Сустрэча з сынам" з падабранымі цытатамі.

- Раскажыце, з якім настроем збіраецца Тэкля да сына? *(Першы вучань абараняе свой малюнак. Астатнія вучні дапаўняюць.)*

- Апішыце яе дарогу ў горад. Раскажыце, як адчувае сябе Тэкля ў горадзе? *(Другі вучань абараняе малюнак, тлумачыць выбар цытат. Астатнія дапаўняюць.)*

- Якую галоўную памылку ў сваім жыцці зрабіла Тэкля? Кошт гэтай памылкі. Перш чым адказаць на гэта пытанне, прагледзім невялікую інсцэніроўку.

**5.3. Інсцэніроўка (выкарыстанне тэхнікі візуалізацыі) "Сустрэча маці і сына"** *(Дамашняе заданне, група вучняў з пяці чалавек.)*

**6. Гутарка па пастаноўцы**

- Чаму не спраўдзіліся надзеі маці на сына?
- Ці можна назваць Лаўрука ўдзячным сынам і выхаваным чалавекам?
- Чым абумоўлена такое яго стаўленне да роднага чалавека?
- Трохрублёўкі. Як вы думаеце, што азначае гэта мастацкая дэталь?

Паразважайце.

- Як вы думаеце, што адчувае Тэкля зараз? Ці засталіся ў яе душы якія-небудзь пачуцці?

*(Вучні робяць вывад, што не спраўдзіліся надзеі Тэклі, Лаўрук не захацеў прызнаваць маці. Таму што, па-першае, ён не рос побач з бацькамі, а , па-другое, ён стаў панам. Як пан мог прызнаць "маці-жабрачку", грамадства высмеела б і адвярнулася ад яго. Грошы, утаптаныя ў гразь, – гэта надзеі Тэклі.)*

**7. Разрыў**

**7.1. Дамашняе заданне:** прыказкі ці выказванні пра бацькоў і дзяцей

- Зачытайце прыказкі ці выказванні пра бацькоў і дзяцей, якія вы падрыхтавалі дома. *(Дзеці зачытваюць свае варыянты: Якая матка, такое і дзіцятка. Самая балючая рана – ад свайго дзіцяці. Кожнаму сваё дзіця любае.)*

**7.2. Зварот да эпіграфа**

- Вядомы педагог Антон Сямёнавіч Макаранка гаварыў: "Нашы дзеці – наша старасць. Правільнае выхаванне – гэта наша шчаслівая стараць". **Ці можна знайсці прычыну няўдзячных паводзін сына ў адносінах да бацькоў?**

***Вывад:*** *дзіця павінна выхоўвацца ў сям'і. Калі ж бацькі самі аддалі сваё дзіця, дык чаго ж ад сына чакаць удзячных адносін?*

**8. Зварот да праблем урока**

**8.1. Гутарка**

- Я згодна з вамі. А якая яшчэ прычына таго, што Лаўрук адцураўся мацеры?

***Вывад:*** *прычына ў грамадстве, членам якога стаў Лаўрук. Тэкля апынулася на дзясяткі прыступак ніжэй за свайго сына.*

- Малайцы, сацыяльная няроўнасць – адна з галоўных прычын маральнага выбару Лаўрука.

- Ці актуальныя праблемы бацькоў і дзяцей і сацыяльнай няроўнасці сёння?

*(Дзеці робяць вывад, што гэтыя праблемы вельмі актуальныя. Таму што вельмі часта праблемы ў сям'і ўзнікаюць з-за таго соцыума, у які трапляюць дзеці.)*

**8.2. Метад "Кругі Эйлера"**

- Звярніце ўвагу на схемы, якія ў вас на сталах. Зрабіце вывад ***(Дадатак 3)***

- У месцы, дзе кругі сыходзяцца, знаходзіцца сімвал сацыяльнай роўнасці, лічба 10 – гэта лічба мэты ў вобласці ўстойлівага развіцця свету. *(Сімвал можна размясціць асобна,каб дзеці звярнулі на яго ўвагу.)*

*(Вучні робяць вывад, што пакуль дзеці, бацькі і грамадства не дасягнуць роўнасці ва ўсім, гэтая праблема будзе існаваць.)*

**8.3. Зварот да другога эпіграфа**

- У індзейскай прыказцы гаворыцца:

Не ідзі ззаду мяне – магчыма, я не павяду цябе.

Не ідзі наперадзе мяне – магчыма, я не пайду за табой.

Ідзі побач, і мы будзем адным цэлым.

- Як вы разумееце сэнс гэтых слоў? *(Пакуль усе мы, людзі свету, усе краіны, не апынёмся на адной прыступцы, праблемы ў грамадстве будуць заўсёды.)*

- Што мы павінны зрабіць, каб скараціць няроўнасць у грамадстве, паміж краінамі?

**9. Рэфлексія – прыём “ПАПВ”** (разважанне па алгарытму: пазіцыя – абгрунтаванне – прыклад – вынік)

Дзеці працуюць у пяці групах над пытаннем “Ці згодны вы, што скарачэнне сацыяльнай няроўнасці дапаможа паменшыць праблемы ў сем’ях, грамадстве, паміж краінамі?” па алгарытме:

П - пазіцыя - "Мы лічым, што..."

А - абгрунтаванне - "Таму што..."

П - прыклад - "Мы можам даказаць гэта на прыкладзе..."

В - вынік - "Таму мы робім выснову, што... ***(Дадатак 4)***

**10. Падагульненне**

- Ці адказалі мы на галоўныя пытанні нашага ўрока?
- Так што ж адбываецца з чалавекам, калі ён траціць сувязь з бацькоўскім домам?
- Ці правільны маральны выбар зрабіла Тэкля ў жыцці?
- Хто вінаваты ў тым, што дзеці не паважаюць, не любяць сваіх бацькоў?
- Што робіць сацыяльная няроўнасць з людзьмі, грамадствам?
- Ці актуальныя гэтыя праблемы сёння?

**11. Выстаўленне і каменціраванне адзнак.**

**12. Дамашняе заданне:**

1. Дома абняць сваіх матуль і сказаць ім ласкавыя словы.

2. Напісаць невялікае сачыненне-разважанне “Калі б…, то…”.

3. Стварыць сімвал сацыяльнай роўнасці, растлумачыць значэнне кожнага элемента (па групах).

Два пункты дамашняга задання выканаць абавязкова.

**Дадатак 1**

Прыклад рэкламы Старыкавай Валерыі:

Маці і сын… Любоў і сорам. Адчай і нахабнасць.

Чаму Тэкля аддала сына на выхаванне пану?

Беднасць і дастатак…

Душэўная драма маці:

Чаму яна так доўга адкладвала сустрэчу з сынам?

Чаму не спраўдзілася матчына "жаданне сэрцы"?

Тэкля – старая жанчына, жыццё яе было гаротным, радаснага ў ім было вельмі мала.

Тэкля падаравала сыну шчаслівае дзяцінства. А ён выгнаў з дому стомленую, галодную маці. Чаму?...

Лаўрук здраднік ці няшчасны чалавек ? – Здраднікамі не нараджаюцца, а становяцца.

Ці пашкадуе пра свой учынак Лаўрук?

Адказы на пытанні – у апавяданні Змітрака Бядулі “На Каляды к сыну”

**Дадатак 2**



**Дадатак 3**

**“Кругі Эйлера”**



**Дадатак 4**

**Прыём “ПАПВ”**

“Ці згодны вы, што скарачэнне сацыяльнай няроўнасці дапаможа паменшыць праблемы ў сем’ях, грамадстве, паміж краінамі?”

Прыклад работы трэцяй групы:

П - пазіцыя – “**Мы лічым, што** скарачэнне сацыяльнай няроўнасці дапаможа паменшыць праблемы ў сем’ях, грамадстве, паміж краінамі”.

А - абгрунтаванне – “**Таму што** няроўнасць ставіць пад пагрозу сацыяльнае і эканамічнае развіццё грамадства, адсюль усе праблемы: галеча, незадаволенасць людзей сабой, уладай, няроўнасць можа нараджаць злачынствы, выклікаць хваробы і прыводзіць да пагаршэння стану навакольнага асяроддзя.

П - прыклад – “**Мы можам даказаць гэта на прыкладзе**: калі закрануць нас, вучняў 7 “Б”, то не ўсе разумеюць, чаму “Арыне падаравалі шакаладку за тры рублі, а мне за рубель”, а таму што не кожны можа сабе дазволіць патраціць сёння тры рублі бацькоўскіх грошай. Калі закрануць свет, то нават у найбагацейшых краінах па-ранейшаму ёсць цэлыя групы людзей, якія жывуць ва ўмовах крайняй галечы. Сёння па-ранейшаму ідзе барацьба з расізмам”.

В - вынік – “**Таму мы робім выснову, што** няроўнасць закранае ўсіх нас, кім бы мы ні былі і дзе б мы ні жылі. Унутры краін неабходна падтрымліваць сацыяльны і эканамічны рост. Мы не зможам развівацца, калі заўсёды стаяць на месцы і не рухацца наперад”.